Чым карысным для нас можа быць замежны досвед у сферы дзелавога турызму — тэма гутаркі карэспандэнта «Звязды» з беларускім эканамістам і экспертам Леанідам Заікам. СТАР 3

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

30 КАНАЛАЎ

У Круглянскім раёне заручыны спраўляюць напярэдадні Вадохрышча. Вакальны калектыў раённага Дома культуры паказаў народны абрад. Прыгожая дзея адбылася ў доме сям'і Паўлавых. СТАР 8

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

18 СТУДЗЕНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 10 (27375) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«Прыярытэт работы парламента — забеспячэнне рэалізацыі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця»

Прыярытэтам работы парламента павінна быць забеспячэнне рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2011-2015 гады. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў 17 студзеня на рабочай сустрэчы са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімірам Андрэйчанкам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

«У вас ужо склалася пэўнае меркаванне аб новым складзе парламента, яго працаздольнасці, прафесіяналізме. Для мяне гэта вельмі важна. Хацелася б пачуць ваш пункт гледжання, ці хапае вопыту і ці захавана пераемнасць», — сказаў Прэзідэнт.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў у сувязі з гэтым адзначыў, што ў парламент прыйшлі вельмі актыўныя і падрыхтаваныя дэпутаты.

Кіраўніка дзяржавы таксама цікавілі бліжэйшыя планы парламента новага склікання, работа Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. «Ці ёсць у нас там праблемы, некалькі расійскі бок зацікаўлены ў рэалізацыі гэтага глабальнага і вельмі важнага для нас праекта?» — запытаў Аляксандр Лукашэнка.

На думку Прэзідэнта, прыярытэтам у рабоце Нацыянальнага сходу павінна быць заканадаўчае забеспячэнне выканання Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011-2015 гады. Уладзімір Андрэйчанка праінфармаваў кіраўніка дзяржавы, што ў гэтым плане парламентарыі ўжо многае зрабілі. На першай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу пятага склікання прынята 30 законапраектаў, да другой сесіі рыхтуецца 55 законапраектаў, якія ў асноўным накіраваны на мадэрнізацыю эканомікі Беларусі, ад чаго ў сваю чаргу залежаць павышэнне дабрабыту грамадзян і ўмацаванне нацыянальнай бяспекі.

Аляксандр Лукашэнка лічыць карысным, каб падчас рабочых паездак па рэгіёнах краіны яго суправаджалі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, якія б адразу бралі на кантроль канкрэтныя пытанні развіцця таго ці іншага рэгіёна. Прэзідэнт таксама звярнуў увагу на неабходнасць удасканальваць работу дэпутатаў з насельніцтвам, умацоўваць іх узаемадзеянне з мясцовымі ўладамі. Акрамя таго, на сустрэчы быў абмеркаваны блок пытанняў, якія датычацца міжнароднай дзейнасці парламентарыяў, фарміравання рабочых груп па супрацоўніцтве з парламентамі іншых дзяржаў. Уладзімір Андрэйчанка расказаў аб міжпарламенцкім супрацоўніцтве беларускіх і расійскіх заканадаўцаў, падкрэсліўшы канструктыўны і плённы характар гэтага ўзаемадзеяння.

У бліжэйшы час актывізуецца работа з краінамі Паўднёва-Усходняй Азіі. На сярэдзіну лютага запланаваны візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі ў Камбоджу, дзе будуць разгледжаны пытанні выбудоўвання міжпарламенцкіх адносін, а таксама рэалізацыі канкрэтных праектаў.

Чакаецца, што ў пачатку сакавіка Беларусь наведае з візітам старшыня Савета народных прадстаўнікоў Інданезіі. У верасні пройдзе пасяджэнне Міжпарламенцкай асамблеі Асацыяцыі краін Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН), у якім беларускі бок на правах наглядальніка ў гэтай арганізацыі плануе прыняць удзел.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

І СНЕЖНА, І ЛЫЖНА!

На сайце гарналыжнага цэнтра «Сілічы» з'явілася аб'ява: у нядзелю 20 студзеня ў Сілічах адбудзецца Першы абласны фестываль снегу. Галоўнай падзеяй фестывалю стане афіцыйнае адкрыццё хаф-пайпа. Дарэчы, першага ў краіне. Таксама адкрыецца сноўпарк. Акрамя звычайнага катання з гор на лыжах і дошках, катання на каньках, спуску ў цюбінгах, у галоўным гарналыжным цэнтры будзе яшчэ больш экстрыму, без якога аматарам палётаў на снегавых дошках не зведаць асаблівага стану ад моцнай порцыі адрэналіну. Чакаецца наплыў ахвотнікаў скарыць галоўную горную вяршыню. Але і ў гэтыя дні сіліцкія схілы і трамплiны таксама не пустуюць. СТАР. 6

ЛІЧБА ДНЯ

Уладзімір КУХАРАЎ, першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама:

«Гарадскія ўлады просяць аўтааматараў не паркавацца ўздоўж тратуараў, не перашкаджаць рабоце спецыяльнай тэхнікі. Інфармацыя аб пераліку вуліц, дзе будзе праводзіцца прыборка, размяшчаецца на сайтах Мінгарвыканкама і раённых адміністрацый. Тыя аўтамабілі, уладальнікі якіх не ўлічаць нажаданні камунальных і дарожных службаў, падлягаюць эвакуацыі. Таксама заклікаем мінчан аказаць дапамогу ў прыборцы дворовых тэрыторый, у прыватнасці, вакол свайго транспарту. Як паказвае практыка, на поўную ліквідацыю наступстваў такога моцнага снегападу спатрэбіцца 4-5 сутак».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	– 10°
Віцебск	– 14°
Гомель	– 8°
Гродна	– 12°
Магілёў	– 12°
Мінск	– 15°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.01.2013 г.

Долар ЗША	8650,00	■
Еўра	11460,00	▼
Рас. руб.	284,00	▼
Укр. грыўня	1060,92	▼

■ Увага — спажыўцу

«НА БАНК СПАДЗЯВАЦЦА, АЛЕ...

...і самому не агінацца», — заклікаў спажыўцоў банкаўскіх паслуг падчас брыфінгу начальнік галоўнага ўпраўлення кантролю за банкаўскай і знешнеэканамічнай дзейнасцю Камітэта дзяржаўнага кантролю Валянцін ПАТАПОВІЧ.

Камітэт дзяржаўнага кантролю надае істотную ўвагу рабоце са зваротамі кліентаў банкаў. Бо, як падкрэсліў Валянцін Канстанцінавіч, менавіта скаргі спажыўцоў банкаўскіх паслуг часам указваюць на балявыя кропкі «банкаўскага арганізму».

Летась на адрас КДК паступіла 80 заяў, звязаных з дзейнасцю банкаўскай сістэмы. Тэматыка зваротаў незадаволеных кліентаў розная: скардзяцца беларусы і на неабгрунтаваныя дзеянні банкаў, і на парушэнні заканадаўства, і на нясвоечасовы разгляд заяў...

Так, у маі мінулага года мінчанка прыйшла ў адзін са сталічных банкаў і датэрмінова канчаткова разлічылася па крэдыце. Аднак у пачатку чэрвеня ёй патэлефанавалі і папрасілі пагасіць пратэрмінаваную запазычанасць па крэдыце. Гэта інфармацыя аб запазычанасці трапіла ў яе крэдытную гісторыю. Здзіўленая жанчына звярнулася ў КДК і папрасіла дапамагчы аднавіць справядлівасць.

— Сталі разбірацца, — распавядае Валянцін Патаповіч. — Высветлілася, што банк дадаткова неправамерна налічыў працэнты па крэдыце за другую палову мая. У выніку справядлівасць была адноўлена, і крэдытная гісторыя заяўніцы не была сапсавана.

Паводле слоў **начальніка ўпраўлення кантролю за банкаўскай дзейнасцю Камітэта дзяржаўнага кантролю Уладзіміра ВОЛЧАКА**, часам банкі не жадаюць прызнаваць свае вольныя ці нявольныя памылкі. «Так адбылося і ў гэтым выпадку: сам банк стаяў да апошняга і даказваў нам і Нацыянальнаму банку, што ён усё правільна зрабіў і што няма ніякіх парушэнняў».

Яшчэ адзін зварот паказаў, што часам банкі прымяняюць да даўжнікоў штрафныя санкцыі, несуразмерныя сумам дагаворных абавязацельстваў. Так, грамадзянін атрымаў крэдыт памерам 4,4 млн. рублёў і амаль разлічыўся па ім. Астатак непагашанай запазычанасці складаў усяго 144 тысячы рублёў. Банк, у сваю чаргу, налічыў пеню ў памеры 5% ад сумы пратэрмінаванага плацяжу за кожны дзень пратэрміноўкі, што склала 1825% гадавых. І выставіў у суд іск ажно на 5 млн. рублёў, пры кошце крэдыту 4 млн. рублёў.

— Мы ўмяшаліся, бо палічылі памер штрафных санкцый неабгрунтавана высокім, — рэзюмаваў Уладзімір Волчак. — У выніку бакі дасягнулі кампрамісу.

Надзея ДРЫЛА

КАНТРОЛЬ У ЭКАНОМІЦЫ БУДЗЕ ЎЗМАЦНЯЦЦА

Аб гэтым заявіў учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладам старшыню Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандра Якабсона, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

«Я ўжо нямала на гэту тэму гаварыў і хачу яшчэ раз пацвердзіць, што ў Беларусі кантроль будзе ўзмацняцца. Гэта не значыць, што мы будзем хадзіць за кожным, гэта, не дай бог, прывядзе да таго, што мы кагосьці там будзем прыціскаць, заціскаць, нахіляць — гэтага ў нас не будзе. Павінна быць сумленна, прыстойна», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў гэтым напрамку Камітэт дзяржкантролю і працуе. «Але сёння працэсы і развіццё нашага грамадства і эканомікі на такім узроўні, што без кантролю не абысціся. Таму ўсе павінны чуць і разумець, што там, дзе нам трэба, мы будзем прысутнічаць у плане кантролю, перш за ўсё, вядома ж, Камітэт дзяржаўнага кантролю», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў далажыць, якія праблемы КДК трэба будзе вырашыць у бліжэйшы час, а таксама аб тых недахопах, якія сёння ёсць у эканоміцы, грамадстве, міма якіх КДК прайсці не можа.

«Зразумела, мы нікуды не дзенемся ад таго, што Камітэт дзяржкантролю будзе абавязаны кантраляваць расходаванне дзяржаўных сродкаў і рэсурсаў дзяржаўнымі прадпрыемствамі і свята захоўваць дзяржаўную ўласнасць, каб яна не разбазарвалася і эфектыўна сёння працавала. Гэта самае галоўнае для Камітэта дзяржаўнага кантролю», — паставіў задачу Прэзідэнт.

Аляксандр Якабсон у сваю чаргу адзначыў, што праблем застаецца яшчэ даволі шмат і ў сферы бюджэтнага будаўніцтва, і расходавання бюджэтаў краіны і абласцей. Ён падкрэсліў, што ўзначаленае ім ведамства добра разумее ў сувязі з гэтым свае задачы.

Па выніках сустрэчы кіраўнік дзяржавы даў шэраг даручэнняў.

■ Рэзананс

«ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ ПРЭЗІДЭНТА — ГЭТА ЗАКЛІК ДА ГРАМАДСТВА З МЭТАЙ АБМЕРКАВАННЯ ПРАБЛЕМ РАЗАМ»

Прэс-канферэнцыя Аляксандра Лукашэнкі для прадстаўнікоў беларускіх і замежных сродкаў масавай інфармацыі стала нагодай для шырокага абмеркавання ў грамадстве ўзнятых пытанняў. Выказаць свае думкі наконт найбольш рэзанансных тэм, якія закрануў кіраўнік дзяржавы, «Звязда» папрасіла дэпутатаў беларускага парламента.

— Некаторыя замежныя СМІ ацанілі выказванні Прэзідэнта аб інтэграцыі з Расіяй і Казахстанам пераважна як «прахалодныя»...

Мікалай САМАСЕЙКА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах:

— Я думаю, што ён гаварыў не «прахалодна», а асцярожна. Ён жа сказаў, што інтэграцыя не будзе ісці «ні з сяго ні з таго». Таму гэта проста асцярожнасць. Разумееце, інтэграцыя — гэта справа, якая больш ствараецца з аб'ектыўных, а не суб'ектыўных перадумоў. Каб яна запрацавала, неабходныя не толькі суб'ектыўныя пажаданні, але і аб'ектыўныя перадумовы. Гэта не значыць, што такіх перадумоў няма. Яны ёсць. Але ж іх трэба развіваць. Таму такі адказ Прэзідэнта цалкам зразумелы і натуральны. Гэта нармальны, асцярожны, прагматычны адказ.

— Што вы адзначылі для сябе падчас прэс-канферэнцыі?

Святлана ГЕРАСІМОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні:

— Падчас прэс-канферэнцыі Прэзідэнт прадэманстраваў глыбокае веданне жыцця краіны, сваю сумленнасць і адкрытасць. Грунтоўна адказваў на ўсе, нават самыя вострыя, пытанні, сярод якіх, у першую чаргу, выдзяляюцца тыя, што тычацца эканомікі. Яна зараз на першым плане. І гэта тое, што цікавіць усіх, асабліва ў рэгіёнах (і льготнае крэдытаванне жылля, і агульнае эканамічнае развіццё краіны, і шмат іншага). Для сябе я больш за ўсё адзначыла веру кіраўніка дзяржавы ў годную будучыню краіны. На мой погляд, прэс-канферэнцыя Прэзідэнта — гэта заклік да грамадства з мэтай абмеркавання праблем разам. Яна паказала, што Прэзідэнт адкрыты для дыялогу, што ён бачыць развіццё краіны ў сумеснай працы з грамадзянамі.

— Адна з тэм, якая была закранута на прэс-канферэнцыі, тычылася сітуацыі на нашых дарогах — у прыватнасці, мер супраць нецвярозых кіроўцаў. Ці ёсць у вас сваё меркаванне з гэтай нагоды?

— Як дэпутат, як урач і як кіроўца, але ў першую чаргу — як жанчына, маці і жонка, я падтрымліваю кіраўніка дзяржавы ў намерах больш жорстка караць п'яных кіроўцаў за рулём, — сказала **Святлана ШЫЛАВА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы.** — Калі адпаведны законапраект паступіць у парламент, таксама буду выступаць за больш строгія меры — нават да канфіскацыі аўтамабіля ў тых, хто дазволіў сабе сесці за руль нецвярозым. Гэта — небяспека для навакольных. Больш за тое, сёння настаў час для фарміравання негатыўнага стаўлення да алкагалізму ў грамадстве. П'янства разбурае сем'і, фізічнае здароўе людзей і маральнае здароўе беларускага народа. Хацелася б, каб гэта было клопатам не толькі Прэзідэнта і ўрада. Заклікамі і забаронамі мы не вырашым праблему. Важна, каб падключыліся ўсе грамадскія, а таксама — рэлігійныя арганізацыі. Калі мы ўсімі намаганнямі: сям'я, школа, царква, грамадства — будзем ствараць негатыўнае стаўленне да нецвярозага чалавека (прычым не толькі за рулём аўтамабіля, але і на вуліцы, і дома), тады праблема будзе вырашана.

— Якое кіраўніцтва для дзеяння вы пачулі ў адказах Прэзідэнта на пытанні журналістаў?

— Прэзідэнт на прэс-канферэнцыі казаў пра тое, што сістэма аказання паслуг ЖКГ павінна быць празрыстай, — звярнуў увагу яшчэ на адзін аспект **Леанід КАВАЛЕВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве**. — Гэты прынцып адлюстраваны ў новым Жыллёвым кодэксе, які ўступіць у сілу з 1 сакавіка гэтага года. Нашы выбаршчыкі вельмі ў гэтым зацікаўлены. Цяпер у разліковых рахунках грамадзян штомесяц будзе паказана справаздача па выдатках па кожным доме. Хацелася б, каб такая норма існавала і для прыватных структур, якія абслугоўваюць і забудоўшчыкаў, і жыльцоў. Не заўсёды іх работа кантралюецца.

Безумоўна, нам трэба разабрацца з тым механізмам выдаткаў, які існуе ў сістэме ЖКГ. Сёння, асабліва службы раённага звяна, вырашаюць шмат дадатковых пытанняў, якія не фінансуюцца. 18 студзеня мы плануем правесці выязное пасяджэнне нашай пастаяннай камісіі, каб абмеркаваць вырашэнне гэтых пытанняў. Роля міністэрства — вылучыць кожнаму яго абавязкі і прасачыць за тым, каб дадатковая праца камунальных службаў аплачвалася не за кошт квартплаты. Напрыклад, утрыманне ў раённых цэнтрах пашпартных службаў. Механізма кампенсацыі за абслугоўванне пашпартнымі службамі прыватнага сектара зараз няма. Як няма і фінансавання тэрыторый, якія не знаходзяцца на балансе камунальных службаў, але імі абслугоўваюцца. Асабліва — у сельскай мясцовасці.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Уладзіслаў КУЛЕЦКІ. СТАР 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ДЖАКАРЦЕ ПАВОДКА

Выкліканыя праліўнымі дажджамі паводкі і апоўзні ў раёне сталіцы Інданезіі Джакарты і прылеглай да яе правінцыі Бантэн на востраве Ява забралі жыцці 8 чалавек, каля 120 тысяч пазбавіліся даху над галавой. Джакарта практычна цалкам апынулася пад вадой. Узровень вады месцамі дасягае трох метраў. У ноч на чацвер выпала каля 100 мм ападкаў, і сітуацыя пагоршылася. У рэгіёне паралізаваны рух аўтобусаў і прыгарадных цягнікоў. Большасць офісаў і прадпрыемстваў часова закрыта, у школах таксама адменены заняткі. Жыхары горада перасоўваюцца па вуліцах практычна ўплаў — па пояс і нават часам па шыю ў вадзе. Ратавальнікі эвакуіравалі з зоны моцнага затаплення больш за 20 тысяч чалавек. Аказаўся затопленым нават прэзідэнцкі палац.

РАСІЯ НЕ ЗАДАВОЛЕНА ВЕРСІЯЙ ЗША...

Расійскія дыпламаты далі жорсткую водпаведзь сваім амерыканскім калегам у сувязі з выказанымі імі абвінавачваннямі рэжыму Башара Асада ў арганізацыі тэракту ў Алеппа, ахвярамі якога сталі не менш за 80 чалавек. Заадно ў МЗС заклікалі міжнародную супольнасць вызначыцца з прыярытэтамі: галоўнае — спыніць кровапраліцце, а потым ужо няхай разбіраецца Міжнародны трыбунал. «Я па CNN глядзеў паведамленне аб тым, што тэракт быў арганізаваны самімі ўрадавымі сіламі. Большага блюзнерства я не магу сабе ўявіць», — цытуе «Інтэрфакс» міністра замежных спраў Расіі Сяргея Лаўрова, які пракаментаваў рэпартаж CNN.

У АЛЖЫРЫ ПРЫ ШТУРМЕ ГАЗАВАГА РАДОВІШЧА ЗАБІТЫ 35 ЗАЛОЖНІКАЎ

Алжырская ўрадавая армія 17 студзеня пачала штурм газавага радовішча Ін Аменас, дзе ісламісты з 16 студзеня ўтрымліваюць дзясяткі заложнікаў, у тым ліку — замежнікаў, паведаміў у прамым эфіры тэлеканал «Аль-Джазіра». Паводле гэтых даных, падчас бою забіта не менш за 35 заложнікаў і 15 баявікоў. Паводле інфармацыі Reuters, ад тэрарыстаў здолелі збегчы 25 замежных заложнікаў. Усяго паведамлялася аб 41 заложніку-замежніку і як мінімум 150 мясцовых рабочых. France-Presse паведаміла, што падчас штурму алжырскае войска выкарыстала баявыя верталёты.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ВА УКРАІНЕ ПРЫЗНАЛІ ПРАВАЛ ПЕНСІЙНАЙ РЭФОРМЫ

Міністр сацыяльнай палітыкі Украіны Наталля Каралеўская прызнала пенсійную рэформу ў краіне неэфектыўнай.

Каралеўская падкрэсліла, што прынятыя ўладамі меры (у прыватнасці, павышэнне пенсійнага ўзросту для жанчын з 55 да 60 гадоў), «акрамя негатыўных наступстваў, ні да чаго не прывялі». Міністр таксама адзначыла, што «недзеяздольная» рэформа не змагла знізіць дэфіцыт пенсійнага фонду. Па выніках мінулага года ён перавысіў 3,3 млрд. долараў. Запланаваны дэфіцыт ПФУ ў 2013 годзе складае 21,8 млрд. грыўняў (2,7 млрд. долараў).

Пенсійная рэформа ва Украіне стартавала ў кастрычніку 2011 года. Тады ўлады прагназавалі, што ўжо да канца 2012 года Украіна зможа выйсці на бездэфіцытны бюджэт пенсійнага фонду. Гэта неабходная ўмова для пачатку другога этапу рэформы — увядзення назапашвальнай сістэмы пенсійнага забеспячэння.

КАРОТКА

Міністэрства па падатках і зборах размясціла ў адкрытым доступе на сваім афіцыйным сайце рэестр камерцыйных арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў з павышанай рызыкай учынення правапарушэнняў у эканамічнай сферы. У яго ўключана 36 камерцыйных арганізацый і ІП.

Вучоныя Інстытута гісторыі НАН Беларусі падрыхтавалі ўнікальнае выданне — «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII — пачатку XXI ст.». Убачыла свет другая кніга калектыўнай манаграфіі.

Беларусь зняла практычна ўсе абмежаванні на імпарт рыбы. Выключнае права дзяржавы цяпер распаўсюджваецца толькі на імпарт прадуктаў перапрацоўкі рыбы, якія класіфікуюцца кодам 1604 адзінай Таварнай наменклатуры знешнеэканамічнай дзейнасці Мытнага саюза.

У сувязі з пачаткам сезоннага ўздыму захваральнасці на грып і вострыя рэспіраторныя інфекцыі аптэкам прапануюць павялічыць час працы, а некаторым — перайсці на кругласутачны рэжым.

ISSN 1990 - 763X

■ На слыху

БЕЛАРУСКІ ПРЫКЛАД ЯК НАГОДА ЗАДУМАЦЦА

Прэс-канферэнцыя Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі традыцыйна прыцягнула ўвагу не толькі беларускай грамадскасці, але і сусветных СМІ. Нехта вынес у загалоўкі выказванні беларускага лідара адносна знешняй палітыкі, нехта — адносна прыватнага жыцця, нехта засяродзіў увагу на яго ацэнцы эканамічнага становішча Беларусі. Ёсць і тыя, хто знайшоў у адказах Аляксандра Лукашэнкі журналістам глебу для разваг.

Алена Данейка ў сваім рэпартажы для Deutsche Welle, які размясцілі і навасныя прыбалтыйскія сайты, падкрэсліла адкрытасць атмасферы, у якой праходзіла прэс-канферэнцыя. «За кулісамі прэс-канферэнцыі ўсе былі добразычлівыя. Адзіная галосная забарона — на фота. Фатаграфаваць дазволена выключна дзяржаўнаму беларускаму тэлеграфнаму агенцтву,» — расказала яна, заўважыўшы, што пытацца на прэс-канферэнцыі можна было пра што заўгодна. Ніхто пытанні журналістаў не ўзгадняў. Галоўнай тэмай гэтага матэрыялу сталі выказванні кіраўніка дзяржавы пра недарэчнасць патрабаванняў ЕС да Беларусі, а таксама адказы пра палітвязняў і апанентаў.

Замежныя журналісты адзначалі не столькі тое, пра што казаў Аляксандр Лукашэнка, колькі тое, як ён трымаўся, якія пытанні яго, на думку назіральнікаў, раздражнялі (такіх было няшмат). Зусім на іншую тэму, якая была агучана на сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з журналістамі, звярнуў увагу палітолаг Кірыл Бенядыктаў у газеце «Известия». Ён прапанаваў Расіі скарыстацца беларускім вопытам вырашэння праблем бяздомных, які быў агучаны кіраўніком нашай дзяржавы.

«Справа ў тым, што Беларусь — дзяржава сацыяльная, а Расійская Федэрацыя — не (хоць у артыкуле 7 Канстытуцыі РФ сцвярджаецца зваротнае). Зразумела, ёсць эканамісты, якія даказваюць, што беларуская мадэль сацыяльнай дзяржавы нежыццяздольная, што яна грунтуецца не на развітай эканоміцы, а на спекуляцыі расійскай нафтай, якую Мінск купляе танна на Усходзе і прадае задорага на Захад і г.д. Але ж і расійскі росквіт трымаецца галоўным чынам на вуглевадародах, з той толькі розніцай, што ў РФ іх здабываюць, а ў Беларусі — перапрацоўваюць (дарэчы, нядрэнна: беларускі 95-ы бензін цалкам канкурэнтаздольны). Але ў Беларусі пры гэтым — сапраўды якасныя бясплатныя медыцына і адукацыя, развітая сістэма ЖКГ, практычна поўная занятасць насельніцтва. А ў Расіі — карумпаваная ЖКГ, медыцына, у якой «за бясплатна» вам хіба што пажадаюць не хварэць, адукацыя паслядоўна знішчаецца, 5 млн. беспрацоўных (гэта толькі па афіцыйных звестках), натоўпы бамжоў і жабракоў...»

У Беларусі яны таксама ёсць, заўважае аўтар, але няшмат, і ўсе яны знаходзяцца на афіцыйным уліку. Палітолаг звяртае ўвагу на прапанову Аляксандра Лукашэнкі прымусіць працаздольных сацыяльных утрыманцаў працаваць. «І мне асабіста здаецца, што гэта значна больш разумны і эфектыўны шлях», — разважае Кірыл Бенядыктаў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ПРЫМУСОВА ЭВАКУЯВАЦЬ ТРАНСПАРТ БУДУЦЬ ТОЛЬКІ ОРГАНЫ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ І ДЗЯРЖАРГАНІЗАЦЫІ

Адпаведны ўказ № 36 «Аб некаторых пытаннях прымусовай адбуксіроўкі (эвакуацыі) транспартных сродкаў» Прэзідэнт Беларусі падпісаў 17 студзеня, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Дакументам устаноўлена, што прымусовая адбуксіроўка і эвакуацыя транспартных сродкаў павінна ажыццяўляцца з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў, якія належаць органам унутраных спраў або іншым дзяржаўным арганізацыям, або арганізацыям, у статутным фондзе якіх 50 працэнтаў і больш акцый (доляў) знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці.

Захоўвацца прымусова адбуксіраваныя (эвакуяваныя, дастаўленыя) транспартныя сродкі павінны на ахоўных стаянках, якія належаць таксама толькі органам унутраных спраў або дзяржаўным арганізацыям.

Канкрэтныя арганізацыі, якія будуць займацца гэтай дзейнасцю, у двухмесячны тэрмін павінны быць вызначаны мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

У мэтах навядзення парадку ў пытаннях фарміравання тарыфаў на работы па прымусовай адбуксіроўцы (эвакуацыі), а таксама захоўванні транспартных сродкаў паўнамоцтвы па іх зацвярджэнні прадастаўлены аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму.

■ Трымаць марку

КУЛЬТУРНАЯ СТАЛІЦА САДРУЖНАСЦІ

Культурная сталіца патрэбна Беларусі — каб зрабіць даступнымі лепшыя дасягненні нацыянальнай культуры для кожнага беларуса. Культурная сталіца неабходна Садружнасці — каб пашырыць і ўмацаваць культурныя сувязі паміж дзяржавамі СНД, стварыць спрыяльны клімат для эканамічнага і палітычнага супрацоўніцтва. Магілёў сёлета — культурная сталіца Беларусі і краін СНД.

Кожны шкаляр павінен ведаць...

Афіцыйны сертыфікат аб нададзеным Магілёву статусе культурнай сталіцы СНД будзе ўручаны 26 студзеня ў Палацы культуры вобласці. Урачыстае пасяджэнне, прысвечанае 75-гадоваму юбілею Магілёўскай вобласці і ўручэнню прэміі «Чалавек года», завершыцца тэатралізаваным шоу.

— Пасля гэтага пачынаюцца жыццё і праца, — гаворыць начальнік упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Сінкавец. — Гэтае званне — вялікі гонар для ўсіх жыхароў Магілёва, але і вялікая адказнасць. Штодня нам трэба працаваць, каб апраўдаць давер.

Па-першае, неабходна вялікая інфармацыйная работа. Акцыі пачнуцца з дзіцячых навучальных устаноў: кожны шкаляр Магілёва павінен ведаць, што яго горад — культурная сталіца, і вучыцца паводзіць сябе адпаведна.

Інфармацыя павінна з'явіцца на гарадскім грамадскім транспарце, а на чыгуначным вакзале ад імя культурнай сталіцы будуць вітаць гасцей і расказваць ім пра актуальныя падзеі. І нават магілёўскія прадпрыемствы будуць вырабляць сваю прадукцыю з лагатыпам сёлетняй кампаніі.

— Мы хочам, каб пра культурнае жыццё даведалася як мага болей людзей — ад дзяцей і моладзі да пенсіянераў, — тлумачыць Анатоль Сінкавец. — І не проста назіралі, а бралі ўдзел. «Каб не было «асобна культура» і «асобна магілёўцаў».

Яны такія гасцінныя!..

— У кожнай культуры ёсць свае адметнасці, «разынкі» — мы і розныя, і падобныя адначасова, — разважае Анатоль Сінкавец. — Нам хочацца, каб пра нас даведаліся ў іншых краінах. Сяброўства і разуменне — гэта самае лепшае, і ніводны палітык не наладзіць дыпламатычныя і ўсе іншыя стасункі паміж народамі так, як культура і мастацтва.

У Садружнасці незалежных дзяржаў сёлета абраны тры культурныя сталіцы: разам з Магілёвам імі сталі азербайджанскі горад Габала і армянскі Гюмры. Таму мяркуецца спачатку наладзіць сувязі паміж трыма «сталіцамі», і першыя кантакты ўжо адбыліся.

Днямі ў Магілёве пабываў культуролаг з Азербайджана, рэдактар часопіса «Сучаснае культуразнаўства» Абульфаз Бабазадэ. Ён застаўся ў захапленні ад гасціннасці беларусаў. А як даследчык адзначыў, што на тэрыторыі Усходняй Еўропы беларуская культура — адна з найбагацейшых, а Магілёў з'яўляецца скарбніцай беларускай культуры, дзе здолелі захаваць свае старадаўнія традыцыі.

Усё пачнецца адсюль

— Мы пабывалі ў Астане на форуме, — расказаў у сваю чаргу Анатоль Сінкавец. — Там ідзе імклівае развіццё, там «круцяцца», шчыра кажучы, зусім іншыя грошы. Аднак калі мы і адстаём па матэрыяльнай базе, то з творчымі ідэямі знаходзімся ў лідарах. Таму СНД мае намер браць удзел у фінансаванні нашых культурных праектаў.

Адзін з іх — пленэр па жывапісе «Вобраз Радзімы ў выяўленчым мастацтве». Яго ўдзельнікі з розных краін звычайна ездзяць маляваць не толькі ў Магілёўскую вобласць, але і ў Расію. У Магілёўскім мастацкім музеі адбываецца выніковая выстава, але сёлета вынікі пленэру мяркуюць паказаць нават у Маскве.

У гэтым годзе самыя буйныя фестывалі і форумы вобласці будуць стартаваць непасрэдна з Магілёва. Міжнародны фестываль дзіцячай творчасці «Залатая пчолка» першы дзень правядзе ў Магілёве — перад тым як рухацца ў Клімавічы, на беларуска-расійскае памежжа. Гэтак жа будзе і з вядомай «Слаўгарадскай прыпеўкай».

— З Магілёва пачнецца і Глускі фестываль сямейнай творчасці, — дадае Анатоль Сінкавец. — У нас ёсць такая ідэя, каб сем'і, якія прыедуць у беларускую глыбінку для ўдзелу ў гэтым фестывалі, пасяліліся не ў гасцініцы, а ў глускіх сем'ях. І на заканчэнне свята яны разам выйшлі б на сцэну і паказалі сумесную творчасць.

Залатыя шлягеры

Цэнтральным мерапрыемствам культурнай сталіцы павінен стаць міжнародны музычны фестываль «Залаты шлягер».

— Мы мяркуем, што ў вянку сяброўства пакажам кожную краіну Садружнасці, а Азербайджан і Арменію, дзе вызначаны культурныя сталіцы 2013 года, яшчэ і асобна, — раскрывае планы Анатоль Сінкавец.

Самі магілёўцы таксама імкнуцца пашырыць свае культурныя гарызонты. На працягу гэтага года ў абласным цэнтры мяркуюць актыўна развіваць класічны напрамак: опера, балет, класічная музыка — вялікі культурны пласт, у якога ў Магілёве мноства прыхільнікаў. Магілёўцы актыўна запаўняюць залы, і таму цяпер праца ідзе не толькі з Марыінскім, але і з Вялікім тэатрам, які можа браць удзел у дні класікі на «Залатым шлягеры».

Будзе на фестывалі і джазавы дзень — сваю грашовую падтрымку для гэтага прапанавала вядомае прыватнае прадпрыемства. Ва ўпраўленні культуры абяцаюць, што, аддаўшы даніну павагі і любові Іосіфу Кабзону і іншым рэтра-артыстам, на «Залатым шлягеры» не забудуцца і пра моладзь: рок-фестываль на адкрытай плацоўцы цалкам магчымы.

Матэрыяльны складнік

Калі сустракаюць гасцей — наводзяць парадак, таму і ўстановам культуры Магілёва сёлетняе высокае званне пойдзе на карысць, у тым ліку і матэрыяльную.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік ужо даў даручэнне зрабіць рамонт Палаца культуры вобласці, дзе праходзяць самыя буйныя культурныя мерапрыемствы. Давесці да ладу не толькі сам будынак, але і навакольную тэрыторыю: каб запрацаваў фантан, абнавіўся парк атракцыёнаў. «Залаты шлягер» увосень павінен праходзіць ужо ў абноўленым Палацы.

— Таксама сёлета зробяць праект рэканструкцыі музея імя Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, — зазначыў Анатоль Сінкавец. — Гэта гістарычны будынак у цэнтры горада, вельмі прыгожы, і ён павінен адпавядаць узроўню культурнай сталіцы. Будзе абноўлена і экспазіцыя музея гісторыі Магілёва. Карацей, пачынаецца рух. Можа, не ўсё будзе зроблена так, як бы мы хацелі і як распісалі ў планах. Але нас пачулі і заўважылі.

Выхаванне густу

Першая яркая і маштабная падзея культурнай сталіцы запланавана на сакавік. Гэта міжнародны моладзевы тэатральны форум «Сакавік-кантакт», які адбудзецца ў Магілёве восьмы раз. Форум мае вялікі аўтарытэт, дае прастору творчым эксперыментам і выхоўвае густ гледачоў. Гасцей прымае Магілёўскі абласны драматычны тэатр, а білеты з'явяцца ў касах бліжэйшымі днямі. У форуме традыцыйна бяруць удзел тэатры з краін СНД, але сёлета гэта адбудзецца пад знакам культурнай сталіцы.

— Аднак трэба разумець, што культурная сталіца — гэта не толькі сама культура і ўласна мастацтва, — лічыць Анатоль Сінкавец. — Многія кажуць: раз мы культурная сталіца, — то ўвесь год павінны спяваць і танцаваць. Не толькі! Культура — паняцце ўсеагульнае. Усе павінны быць задзейнічаны і ўвогуле зацікаўлены ў культурным жыцці нашага горада.

У агульную культуру ўключаны ўсе сферы. На працоўнай нарадзе папрасілі гандаль наладзіць культурнае абслугоўванне, а камунальнікаў — зрабіць генеральную прыборку. Жыхарам горада прапануюць конкурсы на лепшы двор і вуліцу... Магілёўцаў заклікаюць любіць свой горад, цаніць свой родны кут, падтрымліваць у ім парадак. А таксама быць культурнымі людзьмі, цягнуцца да высокага і трымаць марку культурнай сталіцы Беларусі і СНД.

Ілона ІВАНОВА.

■ Сусветны вопыт

ДЗЕЛАВЫ ТУРЫЗМ: ПРЫЕМНАЕ З КАРЫСНЫМ

У беларускай сталіцы ўсё больш адчуваецца набліжэнне чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе. Адна з прыкмет — будаўнічыя пляцоўкі новых 4- і 5-зоркавых атэляў міжнароднага класа ў Мінску. Як лепш выкарыстоўваць іх патэнцыял для атрымання саліднай валютнай выручкі, чым карысным для нас можа быць замежны досвед у сферы дзелавога турызму — тэма гутаркі карэспандэнта «Звязды» з беларускім эканамістам і экспертам Леанідам ЗАІКАМ.

— Леанід Фёдаравіч, вас можна без перабольшвання назваць заўзятым дзелавым ці кангрэсным (як вам хочацца) турыстам: вы даўно і часта ўдзельнічаеце ў замежных эканамічных форумах, іншых значных мерапрыемствах. Што гэта за турызм?

— Калі ў двух словах, гэта такі від турызму, які дазваляе, не адрываючыся ад рабочага працэсу, удала сумяшчаць карыснае з прыемным, а прымаючаму боку нядрэнна зарабляць на гасцях.

— А можна больш падрабязна?

— Гэта, бадай, адзін з самых старажытных відаў турызму. У «сівыя», як кажуць, часы вельмі абмежаванае кола людзей з-за розных абставін былі вымушаны падарожнічаць з дзелавымі (гандляры), з дыпламатычнымі і разведвальнымі мэтамі (пасланцы князёў, каралёў, цароў і г.д.). Падчас такога далёка не заўсёды бяспечнага кангрэснага турызму назапашваліся яркія і ўнікальныя ўражанні ад убачанага, па якіх потым складаліся кнігі, якія перажылі іх аўтараў. Дастаткова ўзгадаць слыннага італьянца Марка Пола і яго допісы.

Сёння бізнэс-турызм — адзін з відаў турызму, які хутка развіваецца. Тэмпы яго росту ў свеце цяпер складаюць прыкладна 25% штогод, праўда, з папраўкай на фінансавыя і эканамічныя крызісы. Тым не менш, паўсюдна адбываюцца дзелавыя паездкі супрацоўнікаў кампаній, інвестараў, камандзіровак прадстаўнікоў ведамстваў і арганізацый для ўдзелу ў нарадах, шматбаковых перамовах па спрэчных пытаннях, сустрэчы палітычных і грамадскіх дзеячаў. Навукоўцы едуць на канферэнцыі, сімпозіумы і семінары, парадак дня якіх уяўляе ўзаемны інтарэс. Прадпрымальнікі — на спецыялізаваныя міжнародныя выставы, каб сябе паказаць ды на іншых (у тым ліку і на рэальных і патэнцыяльных канкурэнтаў) паглядзець. Адначасова — паспрабаваць знайсці партнёраў, а калі пашанцуе — то і падпісаць выгадны кантракт.

Паралельна з дзелавымі мерапрыемствамі актыўна працуе рынак турысцкіх паслуг: арганізацыя выязных карпаратыўных вечароў і банкетаў, правядзенне пазнавальных экскурсій, арыгінальны адпачынак у новых мясцінах. Усё робіцца для таго, каб госцю паездка запомнілася не толькі вырашэннем сваіх дзелавых пытанняў, змястоўнай дыскусіяй, карысным абменам думкамі з калегамі, магчымасцю атрымаць ад іх свежую інфармацыю, але і ўдалым, паўтаруся, сумяшчэннем прыемнага з карысным, шанцам змяніць звыклую атмасферу.

І там, дзе ўмеюць прапаноўваць лепш за іншых такое сумяшчэнне, прыбыткі ад дзелавога турызму даволі значныя.

— Дзе, напрыклад?

— Скажам, у Іспаніі. Яе мы пераважна ведаем як краіну з выдатнымі ўмовамі адпачынку на марскім узбярэжжы. Але там навучыліся добра зарабляць і на кангрэсным турызме. Дык вось, згодна са справаздачай іспанскай Асацыяцыяй канферэнц-цэнтраў (APCE), у 2011 годзе яе члены прынялі 3.918.629 наведвальнікаў і правялі 4981 мерапрыемства. Сярод іх — 436 кангрэсаў (446.076 дэлегатаў), 393 канферэнцыі (267.403 удзельнікі) і 1324 сімпозіумы (389.348 удзельнікаў). Колькасць міжнародных удзельнікаў кангрэсаў, якія прайшлі ў Іспаніі, павялічылася ў 2011 годзе на 35%, а ўдзельнікаў канферэнцый — на 8%. Гэта прынесла эканоміцы Іспаніі каля 1200 млн. еўра. Думаю, не горш спрацавалі члены APCE ў 2012 годзе.

У нас узяты курс на развіццё агратурызму, але яго шмат у Польшчы, Чэхіі, Літве. А вось адпачынак «дзікуном», без звыклага камфорту, мог бы зацікавіць іншаземцаў.

Хаця геаграфія бізнэс-паездак пастаянна пашыраецца, але па-ранейшаму яны тэрытарыяльна размяркоўваюцца вельмі нераўнамерна. Асноўны аб'ём рынку кангрэснага турызму належыць Еўропе, туды едуць з усяго свету.

— Хто асноўны «пастаўшчык» дзелавых турыстаў у Еўропе?

— На мой погляд, Германія. Штогод звыш 5 млн. немцаў адпраўляюцца ў камандзіроўкі, многія выязджаюць за мяжу, у тым ліку і ў Беларусь.

— А хто лідзіруе па прыёме дзелавых турыстаў?

— У Еўропе — Францыя, Вялікабрытанія, Нідэрланды, Італія, Швецыя, Швейцарыя, Бельгія. У Францыі і Бельгіі кожны дзясяты прыезд іншаземца быў звязаны з дзелавымі мэтамі, у Вялікабрытаніі — кожны трэці. Шмат едуць зноў жа ў Германію — у прыватнасці, на яе вядомыя выставы і кірмашы ў Гановеры, Дзюсельдорфе, Берліне. Гэта тлумачыцца як спрыяльнай кан'юнктурай у многіх галінах прамысловасці, павышаным попытам на інвестыцыйныя тавары гэтай краіны, так і яе развітой транспартнай і турыстычнай інфраструктурай. Немцы традыцыйна ўмеюць дапоўніць дні правядзення выставы цікавымі экскурсіямі, культурнымі фэстамі, арыгінальнымі мерапрыемствамі.

Нашым турыстычным фірмам варта пераймаць гэты досвед, не толькі прапаноўваць наведаць Нясвіж, Мір, Брэсцкую крэпасць, а яшчэ і нешта нечаканае. Скажам, пакіраваць у Жодзіне шматтонным БелАЗам. Дзе яшчэ ў Еўропе такое магчыма? Ды і беларуская прырода — сама па сабе арыгінальная з'ява: у цэнтры Еўропы такія прыгожыя і не кранутыя чалавекам мясціны. Аднак летам падчас адпачынку на прыродзе, вельмі зрэдку сустракаю побач іншаземцаў. Я ўпэўнены, што многім з іх спадабалася б правесці тыдзень на маляўнічым беразе ракі ці возера. У нас узяты курс на развіццё агратурызму, але яго шмат у Польшчы, Чэхіі, Літве. А вось адпачынак «дзікуном», без звыклага камфорту, мог бы зацікавіць іншаземцаў.

Яшчэ хочацца звярнуць увагу на вартую перайманння тактыку еўрапейскіх атэляў: яны заахвочваюць прыезд і членаў сям'і асноўнага дзелавога турыста. Калі, прыкладна, аднамесны нумар на аднаго чалавека ў Еўрапейскім атэлі ў суткі каштуе прыкладна 60 долараў, то на дваіх (скажам, з жонкай) — толькі 75 долараў. Дык чаму б трохі не даплаціць за праезд, пражыванне, харчаванне і даць магчымасць сваёй «палове» ўбачыць новую краіну, засяродзіцца на шопінгу, калі муж працуе на канферэнцыі. Атэлі нібы заклікаюць: падарожнічайце ўдваіх, гэта больш танна. І такая тактыка спрацоўвае ў Амстэрдаме, Лондане, Парыжы, Барселоне, Вене, Капенгагене, Мадрыдзе. Можна доўга пералічваць.

— Аднак гэта ўсё пераважна сталіцы і знакамітыя гарады. А вось горная швейцарская вёсачка Давос стала месцам сустрэч дзелавой і палітычнай эліты планеты. А ці магчымы беларускі Давос?

— А навошта? Я не вельмі веру ў далёкую перспектыву швейцарскага Давоса. Заўважу, апошнім часам зніжаецца цікавасць да сустрэч на яго форумах па актуальных праблемах развіцця сусветнай эканомікі. Хутчэй за ўсё, з часам Давос страціць сваё значэнне. Ва ўсякім разе такая тэндэнцыя намецілася.

— А чым адрозніваюцца кангрэсны турызм ад выставачнага?

— Прынцыпова нічым. Гэта роднасныя паняцці. Адрозненне — у спецыфіцы мерапрыемстваў. Кангрэсна-выставачны турызм уяўляецца мне найбольш дынамічным сегментам рынку дзелавых падарожжаў. Удзел у выставе патрабуе значных сродкаў: плата за арэнду выставачнай плошчы, перавозку ўзораў экспазіцыі і абсталявання, камандзіровачныя і іншыя выдаткі. У адрозненне ад выстаў, кангрэсы, асабліва міжнародныя, арыентуюцца на эксклюзіўнае абслугоўванне, тым самым забяспечваючы загрузку лепшых гасцініц горада. Ужо пабудаваны так званыя кангрэс- і канвэнт-гатэлі, якія здольныя адначасова прыняць да 2 тысяч і ў асобных выпадках нават 5 тысяч чалавек. Гэтыя гіганты сталі звыклай з'явай, напрыклад, у Кітаі і Сінгапуры. У Еўропе на адным кангрэсным мерапрыемстве ў сярэднім прысутнічае 300 удзельнікаў. Сціпла ў параўнанні з Азіяй.

— Апошнім часам за мяжой ды і ў нас набывае папулярнасць так званы інсэнтыў-турызм. Як думаеце, ці мае сэнс нам арыентавацца на інсэнтыў-туры?

— З англійскай «incentive» перакладаецца як «падбадзёрваючы», «заахвочвальны». Пад інсэнтыў-турызмам маюцца на ўвазе паездкі, якім кіраўніцтва камерцыйных фірмаў узнагароджвае сваіх супрацоўнікаў за высокія вынікі працы і тым самым імкнецца павысіць іх матывацыю да больш плённай дзейнасці ў будучым.

Ёсць попыт — будзе прапанова. Хутка з'явіліся турфірмы, якія спецыялізуюцца на арганізацыі заахвочвальных паездак. Іх робяць прывабнымі і цікавымі. Гэта можа быць вячэра ў дарагім загарадным клубе, пікнік на альпійскім лузе, марскі круіз, гастранамічны тур. Скажу шчыра: я не бачу розніцы інсэнтыў-турызму ад звычайнага тура з размяшчэннем у камфартабельным атэлі і насычанай экскурсійнай праграмай. Думаю, нашы турысцкія фірмы будуць з часам больш шчыльна працаваць з айчыннымі і замежнымі прыватнымі паспяховымі кампаніямі, якія могуць сабе дазволіць прафінансаваць заахвочвальныя паездкі для лепшых супрацоўнікаў па Беларусі і за мяжой.

Аднак у мяне ёсць занепакоенасць у сэнсе таго, каб значныя сумы грошай на забавы сваіх работнікаў фірмы не перакладваліся на плечы спажыўцоў пад відам выдаткаў на прадукцыю ці аказанне паслуг. Напрыклад, за семінар на Кіпры па ўдасканаленні продажаў рознічных банкаўскіх паслуг не павінны плаціць кліенты банкаў. На мой погляд, інсэнтыў-турызм таксама можа стаць закамуфляванай формай унутранай карупцыі, асабліва тады, калі на іх запрашаюцца патрэбныя людзі з ліку чыноўнікаў, прадстаўнікоў кіруючых структур і г. д. Гэтага нельга дапускаць.

— Якія перспектывы развіцця дзелавога турызму ў Беларусі, у якой выгаднае геапалітычнае становішча, павялічваецца сацыяльна-эканамічны патэнцыял, перадавая сучасная навука, багатая гістарычная спадчына і цікавыя культурныя традыцыі?

— Так, ёсць перспектыўныя ўмовы для ператварэння Беларусі ў адзін з цэнтраў дзелавога ці кангрэснага турызму. Аднак наша краіна, трэба прызнаць, далёка не поўнасцю выкарыстоўвае свой патэнцыял для развіцця гэтага сегменту турызму. Беларусь — транзітная краіна. Праз яе з усходу на захад і з захаду на ўсход рухаюцца шчыльныя плыні іншаземцаў і, на жаль, не затрымліваюцца. Недастаткова праводзіцца міжнародных мерапрыемстваў у Мінску і рэспубліканскага узроўню мерапрыемстваў у абласных цэнтрах. А Беларусь можа забяспечыць правядзенне на сваёй тэрыторыі семінараў, канферэнцый, дзелавых сустрэч і перагавораў. Я думаю, што для многіх мінскіх гасцініц аказанне кангрэсных паслуг можа стаць адным з асноўных накірункаў прадпрымальніцкай дзейнасці ў недалёкай будучыні. У сувязі з чэмпіянатам свету па хакеі ў Мінску рэканструююцца старыя і будуюцца новыя гасцініцы. Важнай умовай для прыцягнення ўдзельнікаў кангрэсных і выставачных мерапрыемстваў з'яўляецца ступень эканамічнага развіцця краіны і асабліва ўзровень транспартнай інфраструктуры, сродкаў сувязі, гасцінічнай базы. Усё гэта ёсць у Беларусі.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ДАІ ГАТОВА СУПРАВАДЖАЦЬ СНЕГАПРЫБІРАЛЬНУЮ ТЭХНІКУ

Паколькі на дарогах краіны чакаюцца складаныя дарожныя ўмовы з-за снегападаў, у многіх рэгіёнах уведзены план «Надвор'е».

Супрацоўнікамі ДАІ арганізаваны кругласутачны маніторынг стану вулічна-дарожнай сеткі на прадмет своечасовага выканання дарожнымі і камунальнымі службамі работ па прыбіранні снегу і папераджальных мерапрыемстваў па ліквідацыі зімовай коўзкасці. У выпадку неабходнасці будуць арганізоўвацца суправаджэнні снегапрыбіральнай тэхнікі. Пры абвастрэнні дарожнай сітуацыі экіпажы ДАІ будуць патруляваць з уключанымі сінімі праблескавымі маячкамі для прыцягнення ўвагі ўдзельнікаў дарожнага руху і папярэджання аварыйных сітуацый.

Дзяржаўтаінспекцыя просіць кіроўцаў захоўваць правілы паркоўкі і не пакідаць аўтамабілі на краі праезнай часткі, каб не перашкаджаць нармальнаму руху транспарту і працы снегапрыбіральнай тэхнікі. А яшчэ, калі вы не ўпэўнены ў сваіх навыках кіроўцы, лепш адмовіцца ад паездкі на асабістым транспарце і скарыстацца грамадскім.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У МЫТНЫМ САЮЗЕ ЎВОДЗІЦЦА ПОШЛІНА 10 ПРАЦЭНТАЎ НА ПЕРСАНАЛЬНЫЯ КАМП'ЮТАРЫ КОШТАМ ДА $3 ТЫС.

Адпаведнае рашэнне прынята калегіяй Еўразійскай эканамічнай камісіі, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе ЕЭК.

Рашэнне датычыцца непартатыўных персанальных камп'ютараў, уключаючы асобныя віды маноблокаў. Раней памер пошліны складаў 0 працэнтаў.

«Гэта рашэнне павінна садзейнічаць развіццю вытворчасці персанальных камп'ютараў у краінах Мытнага саюза, — растлумачыў міністр гандлю ЕЭК Андрэй Сляпнёў. — Дзякуючы дыферэнцыяцыі па вартасці тавару, яно закранае галоўным чынам офісныя ПК, а стаўкі мытных пошлін, напрыклад, на серверы застануцца на ранейшым узроўні. Паводле ацэнак экспертаў, у краінах МС можа вырабляцца істотна больш ПК, чым сёння. Ва ўмовах вострай барацьбы за экспартныя рынкі на фоне развіцця глабальнага эканамічнага крызісу мы павінны ствараць умовы, якія будуць стымуляваць развіццё вытворчасці высокатэхналагічных тавараў у нашых краінах». Рашэнне аб увядзенні пошліны ўступіць у сілу 26 студзеня 2013 года.

ПЕРШАЯ ВІЦЕБСКАЯ «АЛІМПІЯДА»... МАРЖОЎ

У Віцебску адбудзецца першынство горада па зімовым плаванні ў рамках праваслаўнага свята Вадохрышча.

«Алімпіяда» маржоў адбудзецца 19 студзеня на Заходняй Дзвіне ў Парку культуры і адпачынку імя Савецкай Арміі. Сярод арганізатараў спаборніцтваў — аддзел фізічнай культуры, спорту і турызму Віцебскага гарвыканкама, клуб аматараў зімовага плавання.

Спаборніцтвы будуць праводзіцца па трох узроставых катэгорыях: да 20, 40, 50 гадоў на дыстанцыях і на час знаходжання ў вадзе. Як падкрэслілі арганізатары, да спаборніцтваў дапускаюцца ўдзельнікі, якія прайшлі спецыяльную падрыхтоўку і атрымалі дазвол медыкаў для ўдзелу ў такіх экстрэмальных выпрабаваннях.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЛЮДЗЯМ З ЦЯЖКІМІ ХРАНІЧНЫМІ ЗАХВОРВАННЯМІ СУПРАЦЬПАКАЗАНА АКУНАЦЦА Ў ПАЛОНКУ

Пра гэта журналістам паведаміў галоўны тэрапеўт Міністэрства аховы здароўя Беларусі Вадзім Сушынскі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Людзям, якія маюць цяжкія хранічныя захворванні, акунанне ў ваду і калядныя маразы супрацьпаказаны. Бо такая нагрузка можа справакаваць абвастрэнне гэтых захворванняў», — сказаў Вадзім Сушынскі.

У спіс хвароб, з якімі не рэкамендуецца апускацца ў вадаёмы зімой, уваходзяць і сардэчна-сасудзістыя захворванні. Акунанне ў ледзяную ваду супрацьпаказана людзям, якія пакутуюць ад ішэмічнай хваробы сэрца, тым, хто перанёс інфаркт міякарда, мае артэрыяльную гіпертэнзію. Нельга лезці ў палонку людзям з захворваннямі цэнтральнай нервовай сістэмы. Таксама акунанне ў калядныя маразы абсалютна супрацьпаказана людзям, якія пакутуюць ад эпілепсіі, і тым, хто меў эпізоды страты прытомнасці або пакутуе ад захворванняў, якім гэта ўласціва.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вадзім Сушынскі падкрэсліў, што для купання ў зімовы перыяд патрэбна падрыхтоўка: «Падрыхтоўка да акунання ў палонцы павінна пачынацца задоўга да яго. Гаворка ідзе пра працэдуру загартоўвання».

Акунанне прадугледжвае знаходжанне чалавека ў ледзяной вадзе непрацяглы час — усяго пару секунд.

29 января 2013 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Лунинецлес».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Лунинецлес»: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Первомайская, 56.

Место проведения собрания: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Первомайская, 56.

Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 20.01.2013 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества. Совет директоров.

УНП 200251040

ОАО «Минскторгмаш»

сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится 28 января 2013 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 22.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

• Рассмотрение и утверждение сумм выплат работникам ликвидационной комиссии.

Регистрация начинается в 9.45. При себе иметь паспорт.

УНП 100103798 *Наблюдательный совет.*

У суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці паступіла заява аб прызнанні без вестак адсутным **Цуркана Уладзіміра Вілюцінавіча**, які нарадзіўся 05 красавіка 1961 года ў г. Крывы Рог Днепрапятроўскай вобласці Украіны, апошняе вядомае месца жыхарства якога Украіна, Нікалаеўская вобласць, г. Першамайск, вул. 40 гадоў Перамогі, д. 8, кв. 52.

Просім грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Цуркана Уладзіміра Вілюцінавіча, паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

Вниманию акционеров ОАО «Костюковичский леспромхоз»!

В газете «Звязда» № 8 от 16.01.2013 информацию о месте представления предложений акционеров о продаже акций следует читать в следующей редакции: «Могилевская область, 213640, г. Костюковичи, ул. Бахарева, 11а». *УНП 700160680*

ПАНЯДЗЕЛАК, 21 СТУДЗЕНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.15, 8.20 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.45** Навіны.
7.05, 8.05 Дзелавое жыццё.
7.10, 8.10, 18.45, 23.35 Зона Х.
9.10 У цэнтры ўвагі.
С 18.01.2013 заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) и договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Генеральный директор Н.В.Милошевский

УНП 100071325

У суд Полацкага раёна і г. Полацка паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **Ерамеева Ільі Барысавіча**, 25.01.1976 года нараджэння, ураджэнца ст. Даурыя Чыцінскай вобласці РФ, апошняе месца жыхарства: г. Полацк, вул. Валогіна, д. 253, кв. 40, апошняе вядомае месца знаходжання: там жа.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асоб паведаміць вядомыя ім звесткі пра Ерамеева Ілью Барысавіча ў суд Полацкага раёна і г. Полацка на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

ФСООО «Белкоопстрах» в г. Минске информирует о признании недействительными:
- страховые полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездок за границу формы 2РН, 2РП серии БМ №№ 0515042-0515045.

УНП 100706519

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона), по поручению ОАО «140 ремонтный завод» (продавец)

проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом здания хранилища БТИ,

инвентарный номер 610/С-35343, об. пл. 2488 кв.м;

здания хранилища техники НЗ,

инвентарный номер 610/С-34691, об. пл. 1536,6 кв.м,

расположенных по адресу: **Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. Чаловской, д. 19.**

Начальная цена с НДС – 10 126 361 686 бел. руб.

Площадь земельного участка – **1,4650 га** (предоставлен продавцу на праве аренды по 16.10.2032).

Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, **размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.**

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 29.11.2012.

Аукцион состоится **20.02.2013** в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, офис 5. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.02.2013** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: +375 17 280 36 37; +375 29 183 69 71.

E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона), по поручению ОАО «140 ремонтный завод» (продавец)

проводит открытый аукцион по продаже здания КПП корпус № 139,

об. пл. 26,4 кв.м, инвентарный номер 610/С-48302, расположенного по адресу: **Минская обл., Борисовский район, г. Борисов, ул. Чаловской, д. 19,**

В ТОМ ЧИСЛЕ: **ограждение бетонное, 1041 п.м; ограждение кирпичное 197 п.м, ворота металлические шесть штук; ограждение металлическое 227 п.м; ворота металлические 2 штуки; егоза (металлическая проволока), эстакада, пост охраны.**

Начальная цена с НДС – 135 356 520 бел. руб.

Площадь земельного участка – 0,0437 га (предоставлен продавцу на праве аренды по 08.04.2022).

Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, **размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.**

Аукцион состоится **20.02.2013** в 12.30 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, офис 5.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.02.2013** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: +375 17 280 36 37; +375 29 183-69-71.

E-mail: auction@cpo.by.

БОБОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ГОМЕЛЬСКОГО РАЙОНА

27 февраля 2013 года в 15.00

проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Инженерная инфраструктура	Расходы по подготовке (руб.)	Начальная цена земельного участка (руб.)	Задаток (руб.)
1	Бобовичский с/с, д. Уза, ул. Городская, участок № 12	321080801201000223	0,1235 га	Проектируется электроснабжение, водопровод, газоснабжение	1809554 и расходы за опубликование в СМИ	27665235	2766530
2	Бобовичский с/с, д. Уза, ул. Городская, участок № 16	321080801201000226	0,1220 га	Проектируется электроснабжение, водопровод, газоснабжение	2031533 и расходы за опубликование в СМИ	27329220	2732920
3	Бобовичский с/с, д. Уза, ул. Городская, участок № 11	321080801201000225	0,1210 га	Проектируется электроснабжение, водопровод, газоснабжение	1570552 и расходы за опубликование в СМИ	27105210	2710520
4	Бобовичский с/с, д. Уза, ул. Городская, участок № 43	321080801201000224	0,1188 га	Проектируется электроснабжение, водопровод, газоснабжение	1570552 и расходы за опубликование в СМИ	26612388	2661240
5	Бобовичский с/с, д. Сосновка, ул. 8 Марта, участок №114 А	321080800901000121	0,1500 га	Имеется асфальт, электроснабжение	2089371 и расходы за опубликование в СМИ	33152625	3315270
6	Бобовичский с/с, д. Цыкуны, ул. Лесная, участок № 8 А	321080801101000088	0,1444 га	Имеется электроснабжение	2519120 и расходы за опубликование в СМИ	23704704	2370470
7	Бобовичский с/с, д. Цыкуны, ул. Лесная, участок №12 А	321080801101000087	0,1282 га	Имеется электроснабжение	2103045 и расходы за опубликование в СМИ	21045312	2104530
8	Бобовичский с/с, д. Старые Дятловичи, ул. Октябрьская, участок № 36	321080801001000266	0,1457 га	Имеется электроснабжение, водопровод	2459880 и расходы за опубликование в СМИ	17191143	1719120

Аукцион состоится по адресу: Гомельский район, аг. Бобовичи, ул. Пролетарская, д.1 А, зал заседаний Бобовичского сельисполкома **27.02.2013 в 15.00.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток в размере, порядке и срок, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатков (на расчетный счет с отметкой банка).

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5%).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона или единственным участников аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Задаток за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет № 3641414020045 Бобовичского сельского исполнительного комитета, ЦБУ № 305 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Барыкина, 94, МФО 151501664, УНП 400178403, код платежа 04901.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Бобовичи, ул. Пролетарская, 1 А, Бобовичский сельский исполнительный комитет с даты опубликования извещения **до 23 февраля 2013 года.**

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в Бобовичском сельском исполнительном комитете. Контактные телефоны: (8 0232) 910234, 910244, 910247.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ в г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 19 февраля 2013 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни **с 08.00 до 17.00**. Последний день приема заявлений – **14.02.2013** года до 17.00.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Условия проведения аукциона – **наличие не менее двух участников**.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют в сроки, указанные в извещении:

а) документ, подтверждающий **внесение суммы задатка (задатков)** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3641017440554** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж), **с отметкой банка**;

б) документ, удостоверяющий личность **(паспорт и его копию)** покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – **паспорт, копию паспорта и нотариально заверенную доверенность**.

Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: строительство инженерных коммуникаций будет осуществлено в соответствии с проектно-сметной документацией. Продажа земельных участков производится без изменения целевого назначения. Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят **задатки** в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан в течение **10 рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона или признания аукциона несостоявшимся внести плату за **земельный участок** (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) (задаток засчитывается при внесении платы), **возместить затраты на организацию и проведение аукциона**, в том числе **расходы**, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона или единственным участником аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 16 миллионов рублей.

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Кадастровый номер	Стоимость землеустроительного дела (руб.)	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	переулок Жданова, 33	0,1177	740100000006000803	2 477 368	95 846 900	18 211 000
№ 2	улица Ямницкая, в районе жилого дома № 95 (участок № 16)	0,0933	740100000001006456	3 271 350	74 378 000	14 132 000

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

Извещение о проведении торгов по продаже недвижимого имущества ОАО «Мозырьдрев»:

Управляющий объявляет о проведении торгов по продаже недвижимости.

Торги проводятся в форме открытого аукциона.

Торги состоятся 6 февраля в 11.00

по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Социалистическая, 115.

№ лота	Наименование объекта, краткая характеристика объекта (лота)	Начальная цена продажи, руб. (без уплаты НДС)	Задаток, руб.	Шаг аукциона, %	Затраты на подготовку документации
ЛОТ № 1	Изолированное помещение столовой общ. пл. 214,9 кв.м; изолированное помещение клуба общ. пл.166,4 кв.м. Расположенных на площади земельного участка – 0,0928 га.	578 400 000 руб.	11 568 000	5	20 603 884
ЛОТ № 2	Административное здание (кирпичное) общ. пл. 201,8 кв.м; насосная (кирпичная) общ. пл. 16,8 кв.м; канализационная насосная (кирпичная) общ. пл. 48,6 кв.м; склад ГСМ с пристройкой к складу общ. пл. 81,8 кв.м; ограждение железобетонное – 607,2 кв.м; ограждение металлическое – 51,0 кв.м; асфальтное покрытие площ. 2790 кв.м. Расположенных на площади земельного участка – 0,80642 га.	1 580 411 429 руб.	31 608 229	5	21 309 142
ЛОТ № 3	Здание проходной общ. пл. 76,1 кв.м; склад с навесом – 124,3 кв.м; мазутохранилище А1/к-79,1 кв.м; пристройка к мазутохранилищу (электроцех) Б1-2/к-54,4 кв.м; пристройка к мазутохранилищу – 17,1 кв.м; настройка (Б1-2)/к -5,4 кв.м; водоем – 30 кв.м; здание котельной с душевыми помещениями – 275,2 кв.м; пристройка к зданию котельной с душевыми помещениями – 28,5 кв.м; элеватор – 74,1 кв.м; здание ремонтных мастерских с бытовыми помещениями – 324,6 кв.м; здание ТП -50,2 кв.м; гараж – 72,1 кв.м; пристройка к гаражу – 119,6 кв.м; гараж – 39,0 кв.м; склад – 74,5 кв.м; мебельная фабрика – 4412,5 кв.м; склад готовой продукции – 511,1 кв.м; прессовое отделение – 330 кв.м; гараж для грузовых машин – 75,7 кв.м; строительный цех – 97,4 кв.м; навес № 1 – 146,9 кв.м; навес № 2 – 93,7 кв.м; навес № 3 – 89,2 кв.м; асфальтно-бетонное покрытие – 3975,0 кв.м; ограждение железобетонное – 316,8 кв.м; кабельные сети протяженностью 3880 м, канализационные сети протяженностью 3515 м, водопроводные сети протяженностью 3515 м. Расположенных на площади земельного участка 1,22796 га.	7 822 788 571 руб.	156 455 771	5	38 737 341
ЛОТ № 16	Площадка для складирования металлопродукции инв. № 6769, пл. 2719 кв.м	400 025 681 руб.	8 000 514	5	3 168 323
ЛОТ № 17	Участок по производству тары (здание паркета) инв. № 233, пл. 325 кв.м	318 749 215 руб.	6 374 984	5	5 092 803
ЛОТ № 18	Здание мазутонасосной инв. № 6764, пл. 24 кв.м	22 711 550 руб.	2 271 155	5	1 604 890
ЛОТ № 19	Здание электроцеха 330/С-5933, инв. № 41878, пл. 530	242 688 600 руб.	4 833 772	5	1 129 376

Имущество расположено по адресу: **Гомельская область, г. Мозырь, ул. Гоголя, 61.** Для участия в торгах необходимо:

1. **Оплатить задаток в размере 2% от начальной цены лота на р/с 3012002731231 в ф-ле № 317 ОАО «АСБ Беларусбанк» ул. Советская 130, МФО 151501678, УНН 400088836, г. Мозырь.**

2. **По 1 февраля 2013 г. включительно в рабочие дни с 8.00 до 17.00** подать заявление на участие в торгах и другие документы в соответствии с законодательством по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Социалистическая, 115.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателям – копия (без нотариального засвидетельствования)свидетельство о государственной регистрации; юридическим лицам – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо предоставляет его руководитель), а также копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организации; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документы о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

В случае, если аукцион признан не состоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник торгов имеет право до начало торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Не явка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона, заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, методическими рекомендациями об особенностях оценки и продажи имущества должника, находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) № 144 от 29.11.2010 г.

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8(0236) 35-60-80, 35-64-99; (029) 685-68-01; (029)834-38-97.

■ Як жывяце, землякі?

У РЭГІЁНЕ

Брэстчына

ЧАЛАВЕКА ВЫРАТАВАЎ, ВЫБУХ ПАПЯРЭДЗІЎ

Пажар у вёсцы Абяроўшчына Камянецкага раёна ледзь не прывёў да непрадказальных наступстваў. Іх папярэдзіў супрацоўнік раённага аддзела МНС Аляксей Скулавец

26-гадовы сяржант унутранай службы позна ўвечары падвозіў сяброў з Камянца ў Высокае. Па дарозе дадому (Абяроўшчына знаходзіцца крыху ўбаку ад трасы) ён заўважыў падазронае зарава і вырашыў праверыць. Калі пад'ехаў бліжэй, у вокнах аднаго з дамоў убачыў языкі полымя. Аляксей найперш пазваніў па нумары 101, а потым выламаў дзверы, якія былі замкнуты, і ўвайшоў у дом, запоўнены дымам. Гаспадара, моцна п'янага, сяржант знайшоў у каморы. Выцягнуў мужчыну на вуліцу, а сам вярнуўся ў дом, бо заўважыў два балоны звадкаванага газу. Да прыезду баявога разліку Аляксей Скулавец выкаціў абедзве ёмістасці з газам. Калі б газ выбухнуў, цяжка нават прадказаць наступствы для суседніх дамоў.

Як сказаў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Камянецкага райаддзела МНС Аляксандр ГРЫЦУК, зараз рыхтуюцца дакументы для прадстаўлення доблеснага супрацоўніка аддзела да ўзнагароды.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Віцебшчына

СВЯТЛАФОРАЎ СТАНЕ БОЛЬШ

Віцебскім аблвыканкамам на гэты год выдзелена каля мільярда рублёў на ўстаноўку святлафораў

Калі больш правільна, трэба святлафоры называць святлафорнымі аб'ектамі, адзначылі ва Упраўленні ДАІ кіраўніцтва ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама. Бо на скрыжаваннях дарог, пешаходных пераходах устанаўліваюць не адзін святлафор, іх можа быць ад 6 да 20 — цэлы комплекс. Толькі ў Віцебску зараз 90 святлафорных аб'ектаў.

Кошт такіх аб'ектаў вельмі вялікі. У прыватнасці, на звычайным пешаходным пераходзе ўстаноўка аб'екта абыходзіцца на суму каля 150 мільёнаў рублёў. Калі аб'ект узводзіць на скрыжаванні дарог — у некалькі разоў больш. Святлафоры сёлета ў Віцебску плануецца ўстанавіць на вуліцы Петруся Броўкі, на праспекце Фрунзэ (ля крамы «Ніка»), на праспекце Будаўнікоў — у раёне Лядовага палаца... Святлафоры ўстанаўліваюцца на ўчастках дарог, якія прызнаюцца аварыйнымі і лічацца месцамі канцэнтрацыі ДТЗ.

Што тычыцца так званых «ляжачых паліцэйскіх», толькі летась на тэрыторыі Віцебшчыны зрабілі каля 110 штучных няроўнасцяў і ў тым ліку каля 40 — у Віцебску.

— Прыпадняты пешаходны пераход — рэч вельмі эфектыўная, прымушае вадзіцеляў зніжаць хуткасць на нерэгуляваных пешаходных пераходах, — канстатуюць спецыялісты ў вобласці бяспекі руху. — Чым меней хуткасць, тым меней верагоднасць учыніць ДТЗ.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Гомельшчына

САМЫ СУЧАСНЫ ТАМОГРАФ — У СВЕТЛАГОРСКУ

У Светлагорскай цэнтральнай раённай бальніцы адбылося ўрачыстае адкрыццё кабінета рэнтгенакамп'ютарнай дыягностыкі

Ён абсталяваны сучасным тамографам вытворчасці японскай фірмы Toshiba. Апарат такога класа на гэты момант адзіны ў Гомельскай вобласці. Сродкі, а гэта Br11,7 мільярда, выдаткаваны з абласнога бюджэту. Акрамя таго, больш за Br2 мільярды спатрэбілася на праектныя і будаўніча-мантажныя работы для рэканструкцыі і камплектацыі кабінета. Частку з іх жыхары Светлагорска зарабілі на раённым суботніку, частка выдаткавана са сродкаў раённага бюджэту. Побач з кабінетам усталяваны гідраўлічны пад'ёмнік, які забяспечыць магчымасць дастаўкі ў рэнтгенаўскі кабінет пацыентаў у цяжкім стане.

Плануецца, што кабінет будзе працаваць з 8 да 18 гадзін, што дазволіць абследаваць да 25 пацыентаў у дзень не толькі са Светлагорска, але і з Акцябрскага раёнаў. Як расказалі ва ўпраўленні аховы здароўя Гомельскага аблвыканкама, сёння ў вобласці функцыянуе 10 камп'ютарных тамографаў і 3 магніта-рэзанансныя тамографы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Гродзеншчына

ДЗІЦЯЧЫЯ МАРЫ — У РЭАЛЬНАСЦЬ!

На падарункі дзецям было сабрана каля 66 мільёнаў рублёў

Дабрачынная акцыя «Калядкі ў Элізы Ажэшкі», якую арганізавалі ўдзельнікі студэнцкага праекта «Жывая гісторыя» пры падтрымцы мясцовых уладаў, Беларускага дзіцячага фонду і Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Я. Карскага, завяршылася днём дзіцячых жаданняў. Ажыццявіліся запаветныя мары выхавальнікаў Гродзенскага раённага сацыяльна-педагагічнага цэнтра ў вёсцы Лойкі, дзіцячых дамоў змешанага тыпу Кастрычніцкага раёна г. Гродна і ў Панямуні — яны атрымалі канструктары, веласіпеды, мабільныя тэлефоны, лялькі, спартыўныя касцюмы і пальчаткі... Прычым, разам з казачнымі персанажамі падарункі ўручала быццам сама Элізa Ажэшка, якая ў свой час ладзіла дабрачынныя вечарыны.

Большую частку з сабранай сумы забяспечыў дабрачынны аўкцыён карцін, якія былі прадастаўлены гродзенскімі мастакамі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Магілёўшчына

ЭЛІТНАЕ МАСТАЦТВА ПРЭЗЕНТУЕ МУЗЕЙ

Альбом твораў з калекцыі Магілёўскага мастацкага музея імя Паўла Масленікава выйшаў у свет

Альбом выкананы магілёўскім выдавецтвам «Амелія Прынт». У ім 250 фотаздымкаў мастацкіх твораў. Гэта экспанаты з музейнай калекцыі — жывапіс і графіка (свае лепшыя творы дарылі музею сотні мастакоў), скульптура і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, а таксама абразы і фрэскі. Тыраж склаў 500 асобнікаў. Шыкоўны альбом-каталог прызначаны не для продажу, а для прэзентацыі Магілёўскага мастацкага музея і ў якасці падарунка афіцыйным асобам, якія наведваюць рэгіён.

Дырэктар музея Аляксандр Хахракоў расказаў, што ёсць ідэі выдаць паштоўкі з рэпрадукцыямі карцін і вырабіць іншую сувенірную прадукцыю для шырокай публікі, але даводзіцца глядзець на сітуацыю рэалістычна і шукаць на гэтую справу спонсарскія грошы.

Дарэчы, на супервокладцы новай кнігі — гістарычны будынак у цэнтры Магілёва, дзе месіцца сам музей. Гэты помнік архітэктуры пачатку XX стагоддзя вядомы яшчэ і тым, што адсюль з браніравання пакоя сейфа на пачатку вайны бясследна зніклі каштоўнасці, у тым ліку і крыж Еўфрасінні Полацкай.

Ілона ІВАНОВА.

Міншчына

ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАЕ

У Вілейскім краязнаўчым музеі адкрылася першая персанальная выстава дызайнера Алы Судніковіч

Працяглы час яна адказвае за афармленне горада, а цяпер вырашыла паспрабаваць сябе ў новым ракурсе. Экспазіцыя твораў Алы Судніковіч унікальная ўжо таму, што ў ёй прадстаўлены работы адразу ў некалькіх тэхніках. Карціны, а іх некалькі дзясяткаў, нагадваюць традыцыйныя беларускія арнаменты і ўзоры. А ў гэтым, як вядома, пераемнасць традыцыйнага і сучаснага мастацтва. Паводле слоў самой мастачкі, тут прадстаўлены работы ў змешаных тэхніках: «Калі першы блок больш дэкаратыўна-стылізаваны, то другая частка — хутчэй дызайнерская. А ў галаве ўжо ёсць новыя праекты, новыя думкі. Хачу паспрабаваць нешта новае, хачу пісаць нашы беларускія дываны».

Антон ЗАПОЛЬСКІ

■

■ Традыцыі і сучаснасць

АДНОЙЧЫ РАНІЦАЙ «ВЫЦЯГНУЛА» МІХАІЛА

У Круглянскім раёне заручыны спраўляюць напярэдадні Вадохрышча. Вакальны калектыў раённага Дома культуры паказаў народны абрад.

У вёсцы Старая Радча Круглянскага раёна артысты сабраліся для хатняга прадстаўлення. Прыгожая дзея адбылася ў доме сям'і Паўлавых. Валянціна і Іван гасцінна сустракалі гасцей. Пры ўсім тым, што ўвесь дом — пераканальная дэманстрацыя таго, як можна камфортна жыць у сельскай мясцовасці, усё ж адзін пакой — нібыта з мінулага, дзе захоўваюцца ўсе традыцыі.

Печка з ляжанкай, вышываная бялізна на ложку з вялізнымі падушкамі, чырвоны кут з абразамі і ручніком, а на стале — традыцыйныя беларускія прысмакі ў гліняным посудзе. Навокал сабраліся людзі ў прыгожых народных строях. Яркія фарбы, шчырыя ўсмешкі. У акно свеціць зімовае сонца. Каля ног трэцца кот Васька і — насуперак драпежніцкай тыгрынай размалёўцы — дэманструе лагодны характар. Гарманіст гатовы іграць, і сваты з песнямі заходзяць у дом.

— Уратуй, Божа, хату! — пачынае абрад гаспадар і малюе белай крэйдай крыжы на дзвярах.

Далей артысты размаўляюць і спяваюць, дамаўляюцца і святкуюць шчаслівыя заручыны.

— Гэта заўсёды была добрая прыкмета — дамовіцца на Вадохрышча пра вяселле, — кажуць круглянцы.

На Святкі таксама варожаць, і мясцовыя жанчыны прызнаюцца, што ім падабаецца гэтая забава. Маўляў, ад добрай варажбы да заручын — нядоўгі шлях.

— Калі мы былі маладымі, то заўсёды варажылі, — прызнаецца Лідзія Галыхіна. — На паперках пісалі розныя мужчынскія імёны, клалі іх пад падушку. І аднойчы раніцай я «выцягнула» «Міхаіла». Так і спраўдзілася: пасля вучобы я прыехала на працу, дзе знайшоўся неўзабаве хлопец Міхаіл!

— Ой, і боты кідалі, і дровы насілі! — смяецца Галіна Мяцеліца. — Верылі альбо не, але рабілі. Я сама выцягнула пярсцёнак з жыта, і мне сказалі, што будзе добры муж. Так і аказалася ў жыцці. І цяпер дзяўчаты варожаць. Традыцыі застануцца і будуць жыць.

— Калі я быў юнаком, то бачыў, як мая сястра і яе сяброўкі варажылі, — узгадвае гарманіст Мікалай Куксянкоў. — Гэта было цікава: натуральна і па-свойму прыгожа, таямніча. У такое верылася!

Артысты, якія выконвалі ролі маладых, ездзяць на сучасных аўтамабілях, носяць джынсы і перапісваюцца ў сацыяльных сетках з усім светам, але старадаўняй варажбой усё ж не грэбуюць.

— Я ўвогуле веру ў розныя народныя прыкметы, таму і сам агароджу абдымаў, — смяецца Аляксей Ківель. — Гавораць, калі ў па́ру — то жэнішся. У мяне нібыта было ў па́ру, але я пакуль не жанаты. Хаця калі сур'ёзна, то мне падаецца, што старыя абрады ўсё ж адыходзяць у мінулае. Выйдзеш на вуліцу — а моладзі там няма. Усе сядзяць у інтэрнэце. А як у інтэрнэце варажыць?

— Ай, няма ўжо той старадаўняй варажбы! — уздыхае маладая артыстка Вольга Сушко. — Цяпер гэта больш жарт, чым сур'ёзная справа. І я плот абдымала. І боты кідала: куды паляціць — з таго боку і жаніх прыйдзе. Пакуль не прыйшоў. Буду чакаць.

Што ж, роля маладой у абрадзе заручын на Вадохрышча ўжо сыграна, цяпер трэба перанесці прыгожую казку ў жыццё, каб яно было шчаслівым.

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.

Круглянскі раён

■ На слыху

ПІВА МОЖА ЗНІКНУЦЬ З ДРОБНАЙ РОЗНІЦЫ

У Магілёўскай вобласці мяркуюць абмежаваць продаж піва і слабаалкагольных напояў у кіёсках, палатках і аўтакрамах.

Грамадскую думку жыхароў Магілёўскай вобласці на гэты конт вывучыла ўпраўленне гандлю Магілёўскага аблвыканкама. У сацыяльным апытанні брала ўдзел больш за 400 чалавек, з якіх толькі каля паўсотні выказаліся супраць рашэння аб абмежаванні, «таму што хопіць забараняць». Большасць жа выступіла за абмежаванне як за меру па пераадоленні алкагалізацыі насельніцтва і абароне маладога пакалення.

У далейшым упраўленне гандлю плануе сустрэчы з прадстаўнікамі малога бізнэсу і разгляд пытання на абласной камісіі па рэалізацыі патрабаванняў Дырэктывы Прэзідэнта № 1 «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны». Толькі пасля гэтага будзе выпрацавана рашэнне з улікам думкі большасці.

Ілона ІВАНОВА

■ Інфарм-укол

Карамелька для хворага горла

Калі ў вас ёсць насмарк, чханне, слёзацячэнне, боль у горле, кашаль, невысокая тэмпература, якая можа суправаджацца дрыжыкамі і болем у мышцах, галаўны боль, агульнае дрэннае самаадчуванне, значыць вы сутыкнуліся з прастуднай інфекцыяй. Прастудныя захворванні выклікаюць вірусы. Вядома звыш 200 тыпаў вірусных штамаў, здольных выклікаць рэспіраторныя інфекцыі. Да іх ліку адносяцца, скажам, рынавірусы, якія часцей за ўсё атакуюць нашы нос і горла.

Прастуды ў большасці выпадкаў праходзяць бясследна, аднак часам да іх могуць далучацца сур'ёзныя бактэрыяльныя інфекцыі, якія патрабуюць лячэння. Звычайна непрыемны стан доўжыцца 3-4 дні, але выздараўленне можа наступіць і праз 10-14 дзён.

Шэраг бактэрый (напрыклад, пнеўмакокі або стрэптакокі, вірусы — таго ж грыпу, а таксама хімічныя раздражняльнікі) можа выклікаць пнеўманію — запаленне тканак лёгкіх. Вядома звыш 50 розных прычын гэтага стану. Захворванне можа праявіцца ў лёгкай форме, суправаджаць прастуду, а можа і пагражаць жыццю.

Лячэнне будзе залежаць ад прычыны пнеўманіі і цяжкасці яе сімптомаў. У цяжкіх выпадках можа спатрэбіцца і шпіталізацыя.

1. Пазбягайце блізкага кантакту з людзьмі, у якіх ёсць прыкметы захворвання — чханне, кашаль, тэмпература.
2. Пазбягайце доўгага знаходжання ў шматлюдных месцах.
3. Не дакранайцеся часта да рота і носа.
4. Часцей мыйце рукі з мылам або прымяняйце сродак для дэзынфекцыі рук на спіртавой аснове.
5. Нягледзячы на нізкія тэмпературы паветра за акном, рэгулярна праветрывайце памяшканні.
6. Пры кантакце з хворым карыстайцеся ахоўнымі маскамі.
7. Прытрымлівайцеся здаровага ладу жыцця: паўнацэнны сон, рацыянальнае харчаванне, фізічная актыўнасць, прагулкі на свежым паветры.

— Пры дрэнным самаадчуванні трымайцеся ад здаровых людзей на адлегласці (1 метр).

— Прымайце вялікую колькасць вадкасці.

— Мыйце рукі пасля чхання, кашлю, карыстання насоўкай.

— Калі захварэла дзіця, звярніцеся па медыцынскую дапамогу да ўрача.

— Давайце дзіцяці шмат вадкасці. Стварыце яму камфортныя ўмовы, супакойце.

Святлана БАРЫСЕНКА

Даты | Падзеі | Людзі

1401 год — у Вільні падпісана Віленска-Радамская унія, дзяржаўны саюз Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы. Акты, якія аформілі новую ўнію, выдадзены польскім каралём Ягайлам у 1400-м і Вітаўтам 18 студзеня 1401-га ў Вільні. Вітаўт атрымаў ад Ягайлы ВКЛ у пажыццёвае кіраванне разам з рускімі ўдзельнымі княствамі з правам свабоднага правядзення ўнутранай палітыкі. Ягайла захаваў тытул вярхоўнага князя літоўскага, а Вітаўт афіцыйна атрымаў тытул вялікага князя літоўскага. У гэты дзень у Вільні епіскапы, князі і баяры ВКЛ выдалі акт, у якім абавязаліся не парушаць дагавор паміж Ягайлам і Вітаўтам. Польскія паны аналагічны акт выдалі 11 сакавіка таго ж года ў Радаме. Упершыню ўнія паміж ВКЛ і Польшчай набыла характар дагавора паміж двума народамі.

1216 год — завяршылася княжанне ў Полацку Уладзіміра, князя полацкага. У «Хроніцы Лівоніі» Генрыха Латвійскага ён называецца каралём Полацка. Вёў барацьбу супраць нямецкіх рыцараў, у пачатку XIII стагоддзя атрымліваў даніну ад ліваў і латгалаў, у саюзе з імі здзяйсняў паходы на захопленыя нямецкім ордэнам гарады Гольм, Ікскюль. Падрыхтаваў сумесны паход палачан і літоўцаў на Рыгу, але ў дзень выступлення нечакана памёр.

1882 год — нарадзіўся Іосіф Рыгоравіч Лангбард, беларускі архітэктар, заслужаны дзеяч мастацтваў і архітэктуры Беларусі (1934), доктар архітэктуры, прафесар (1939). Адзін з заснавальнікаў савецкай архітэктуры Беларусі. Сярод работ у Мінску: Дом урада, Цэнтральны Дом афіцэраў, будынак Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, галоўны корпус НАН Беларусі. Адзін з аўтараў «Эскіза планіроўкі Мінска» і схемы генплана пасляваеннага Гомеля. Памёр у 1951 годзе.



Было сказана

Андрэй ВОЛЯН (1530-1610), палітычны дзеяч, філосаф, правазнавец, ідэолаг Рэфармацыі на Беларусі:

«Справядлівасць патрабуе сумленна жыць, нікому не чыніць шкоды, кожнаму аддаваць тое, што яму належыць па праве, за добрыя справы ўзнагароджваць, а за дрэнныя — караць».

Па гарызанталі: **1.** Ядомы шапкавы грыб сямейства сыраежкавых. **6.** Граматычна і інтанацыйна аформленая адзінка мовы. **9.** Частка горада ў дарэвалюцыйнай Расіі. **10.** Каратахвосты рак. **11.** Гл. фотаздымак. **13.** Курортны горад у Краснадарскім краі. 15. Асадкавая горная парода, шырока ўжываецца ў вытворчасці цэглы. **16.** Лёгкае пакрывала ў жанчын-мусульманак. **17.** Прасвет у сцяне будынка, запоўнены рамай са шклом для доступу святла. **18.** Маладая трава, якая выросла на месцы скошанай у той жа год. **20.** Агульная назва розных відаў артылерыйскай зброі. **21.** Эстонскі жывапісец і графік («Багаты ўлоў», 1959). **23.** Чырвоная качка. **25.** Збудаванне для бягучага рамонту самалётаў. **29.** Рускі архітэктар, прадстаўнік класіцызму. **31.** Паэма М.Ю. Лермантава. **32.** Раздзел мовазнаўства. **34.** Рэчыва ў газападобным стане; утвараецца з вадкасці пры награванні. **36.** У дарэвалюцыйнай школе журнал, у які заносіліся звесткі аб паводзінах і правіннасцях вучняў. **37.** Агульная назва часціц атамнага ядра. **39.** Вялікі гурт авечак. **41.** Абарыгенка Германіі. **43.** Моцны шахматыст Еўропы 2-й пал. XVIII ст., французскі кампазітар. **44.** Дазволеная колькасць, норма чаго-небудзь. **45.** Наглядчык за працай сялян у пана ў часы прыгону. **47.** Выбар грамадзянства асобай паводле закона. **48.** Каркас воза. **49.** Мэта, разумная падстава. **50.** Некранутае снежнае покрыва. **51.** Сукупнасць літар той ці іншай сістэмы пісьма. **52.** Дрэнны ўчынак. **53.** Раённы цэнтр Гомельскай вобласці. **54.** Галоўная свяшчэнная кніга ісламу.

Па вертыкалі: **1.** Адна з дадатковых гарантый на працу. **2.** Іншаземны бязлітасны заваёўнік XV—XVI ст. **3.** Аказанне матэрыяльнай дапамогі бедным. **4.** Установа сувязі. **5.** Буйная сярэбраная манета ў мінулым. **7.** Мянушка Халімона Глушака (раман І. Мележа «Людзі на балоце»). **8.** Буйная рагатая жывёла з тлустасцю малака да 7%. **10.** Хімічнае злучэнне, у якім маецца вадарод, здольны замяшчацца металам з утварэннем солі. **12.** Заліў Ахоцкага мора. **14.** Прыбудоўка з прыступкамі перад уваходнымі дзвярыма. **15.** Уменне чытаць і пісаць. **19.** Дакумент, які пацвярджае пародзістасць свойскай жывёлы. **22.** Творца літаратурнага твора. **24.** Працэс адкладвання ў абалонках клетак раслін тлушчападобнага рэчыва — суберыну. **26.** Умоўны знак, якім абазначаюць музычны гук. **27.** Апытальны ліст. **28.** Духавы клавішны музычны інструмент. **30.** Вялікі прамысловы і гандлёва-фінансавы цэнтр Канады. **33.** Водбліск, адлюстраванне. **34.** Пост перад Калядамі. У гэты час воўк нема вые. **35.** Узброеныя сілы краіны. **38.** Горад у Італіі ля падножжа вулкана Везувій, на беразе Тырэнскага мора. **39.** Цыркавы артыст. **40.** Песня з рэпертуару «Песняроў». **42.** Адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры і беларускай літаратурнай мовы. **45.** Расліна, у якой лісце супраціўнае, сядзячае, цэласна-крайняе; кветкі сабраны ў кошыкі. **46.** Тое, што ішак. **48.** Ела, ела дуб, ды зламала зуб (загадка).

Склаў Уладзімір ЕСМАНТОВІЧ.

Ноч казала,
што сцежак няма,
Што згубілася
ў гурбах надзея.
«Заставайся», —
прасіла зіма.
«Не спяшайся», —
шаптала завея.
А мне трэба было у вясну,
І, нягледзячы на святлафоры,
Я імчаў, я нікога не чуў —
Руль мацней
і педаль да упору...
Хто мяне скрозь цямноту
правёў,
Захаваў да апошняй хвіліны?
Быў замест святлафорных
агнёў
Пуцяводны агеньчык рабіны.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	9.17	17.24	8.07
Віцебск	9.12	17.08	7.56
Магілёў	9.07	17.14	8.07
Гомель	8.56	17.18	8.22
Гродна	9.31	17.41	8.10
Брэст	9.24	17.48	8.24

Месяц

Першая квадра 19 студзеня. Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Яўгеніі, Іосіфа, Рыгора.*
К. *Малгажаты, Хрысціны, Багуміла, Пятра.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	-12..-10°С	КІЕЎ	-6..-4°С	РЫГА	-16..-14°С
ВІЛЬНЮС	-16..-14°С	МАСКВА	-13..-11°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	-7..-5°С

УСМІХНЕМСЯ

Можна доўга глядзець на ваду, на агонь і на тое, як мужчына сядзіць са шкарпэткай у руках перад кучай чыстых шкарпэтак і шукае пару.

Жыхары горада Сярэднеіванаўска крыху перабралі з навагоднімі феерверкамі: апошняя іх ракета была збіта сістэмай супрацьпаветранай абароны ЗША над Вашынгтонам.

— Каханы, вазьмі мяне тут жа, цяпер, калі ласка!

— А табе абы вячэру не гатаваць!

Мазахіста Андрэя ўкусіў камар: дробязь, а прыемна.

— Што ты падарыў жонцы на Новы год?

— Пуцеўку ў Тайланд.

— А яна што табе?

— Паляцела!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 26.341. Індэкс 63850. Зак. № 309.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 17 студзеня 2013 года.